# у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Парк літаратараў — месца знакавае

**У Саюзе пісьменнікаў Беларусі ствараецца рабочая група з найбольш актыўных літаратараў, якія будуць садзейнічаць новаўвядзенням у Парку пісьменнікаў. Да таго ж СПБ звяртаецца ў Мінгарвыканкам з просьбай дапамагчы ў рэалізацыі задум.**

Многія ведаюць гэтае ўнікальнае месца ў Мінску. Парк пісьменнікаў закладзены два гады таму літаратарамі краіны ў гонар 500-годдзя беларускага кнігадрукавання побач з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Беларусі і пры падтрымцы Мінгарвыканкама.

Гэтая падзея вельмі ўзрадавала творцаў: яны атрымалі магчымасць выкарыстоўваць знакавае месца як цэнтр прыцягнення ўсіх, хто любіць кнігу і захапляецца чытаннем. Парк пісьменнікаў стаў свайго роду сімвалам супольнасці літаратараў. Сёння гэты незвычайны куток варта разглядаць як шматзначны аб'ект, які сведчыць пра беларусаў як нацыю, дэманструе яе духоўнасць і разуменне ролі кнігі ў жыцці.

Паводле задумы дызайнераў, у парку расце «жывая» кніга, а таксама ўстаноўлены камень у гонар стварэння парку, закладзена капсула з імёнамі тых, хто спрычыніўся да справы.

Паркавая зона становіцца ўпрыгажэннем сталіцы, аднак патрабуе і далейшага развіцця. Айчыннай літаратуры ёсць чым здзіўляць чытача. А магчымасці культурнай пляцоўкі ў поўнай меры яшчэ не рэалізаваны.

Пісьменніцкая арганізацыя заклапочана і распрацоўкай праекта добраўпарадкавання тэрыторыі Парку пісьменнікаў, дзе варта было б прадугледзіць устаноўку памятных таблічак, разбіць алеі ў гонар знакамітых творцаў, павялічыць колькасць лавак уздоўж алей і набярэжнай, пасадзіць дадаткова дрэвы і кусты для візуальнага вылучэння тэрыторыі парку на фоне навакольнага ландшафту.

Таксама бачыцца неабходным на схіле паміж будынкам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і набярэжнай ракі Свіслач абсталяваць пляцоўку з летняй сцэнай, прыдатную для арганізацыі мерапрыемстваў СПБ: сустрэч з пісьменнікамі, аўтограф-сесій, літаратурных імпрэз, дзён паэзіі, урокаў мужнасці ды іншых. У гэтым зацікаўлена і Нацыянальная бібліятэка Беларусі, наведвальнікі якой маглі б зазірнуць у літаратурную зону адпачынку.

Гэтая пляцоўка можа быць выкарыстана і падчас святкаванняў Дня горада, Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, іншых святаў і імпрэз, якія ладзяцца пры падтрымцы ўстаноў Мінгарвыканкама і Міністэрства культуры, лічаць у Саюзе пісьменнікаў.

Адна з першачарговых задач СПБ — стварэнне і размяшчэнне ў Парку пісьменнікаў скульптуры, прысвечанай чытачу. Падобныя архітэктурныя арт-аб'екты ёсць у розных гарадах свету. Могуць быць устаноўлены тут і іншыя аб'екты манументальнага мастацтва — помнікі ў гонар пісьменнікаў ці кампазіцыі, датычныя літаратурных герояў. Добра было б, каб да рэалізацыі гэтых задумак магла б далучыцца Беларуская акадэмія мастацтваў, з якой у СПБ ёсць досвед супрацоўніцтва.

Дарэчы, першапачаткова праект будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прадугледжваў стварэнне побач культурнай зоны, пра добраўпарадкаванне якой зараз і турбуецца СПБ.

У Саюзе пісьменнікаў перакананы, што прапановы, якія хвалююць творчую супольнасць, не застануцца па-за ўвагай кіраўніцтва горада. А Парк пісьменнікаў стане больш змястоўным здабыткам сталіцы і нашым агульным гонарам.

**Алена СТЭЛЬМАХ**



*Камень, закладзены ў гонар Парку пісьменнікаў.*

*Фота з сайта yandex.ru.*